# КРАЙ АДКРЫТЫХ ДУШ І ДЗВЯРЭЙ

## Цяпер грамадзяне большасці еўрапейскіх краін змогуць прыехаць да нас па бязвізе

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову аб устанаўленні парадку часовага бязвізавага ўезду, выезду і знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь праз усе аўтадарожныя і чыгуначныя пункты пропуску дадаткова для грамадзян 35 еўрапейскіх дзяржаў. Аб гэтым гаворыцца ў заяве МЗС Беларусі.**

«У мэтах далейшай дэманстрацыі адкрытасці і міралюбнасці нашай краіны, прыхільнасці да прынцыпаў добрасуседства, а таксама для спрашчэння міжчалавечых кантактаў і паляпшэння свабоды перамяшчэння Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падтрымаў прапанову МЗС і іншых дзяржаўных органаў аб устанаўленні парадку часовага бязвізавага ўезду, выезду і знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь праз усе аўтадарожныя і чыгуначныя пункты пропуску дадаткова для грамадзян 35 еўрапейскіх дзяржаў», — заявілі ў МЗС.

Тэхнічна гэты парадак пачне дзейнічаць з 8.00 19 ліпеня 2024 года.

Такім чынам, грамадзяне ўсіх еўрапейскіх краін, адносна якіх Беларусь прымяняе візавы рэжым, з 19 ліпеня могуць уязджаць і выязджаць праз усе наземныя і паветраныя міжнародныя пункты пропуску Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь па сапраўдных дакументах і знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі не больш як 30 сутак з дня ўезду.

Такі парадак бязвізавага ўезду і выезду будзе дзейнічаць да 31 снежня 2024 года.

Дзеючы рэжым бязвізавага ўезду праз наземныя пункты пропуску для грамадзян Латвіі, Літвы, Польшчы і іншых краін таксама захоўваецца.

Разам з гэтым захоўваецца дзеянне і ранейшага бязвізавага рэжыму пры ўездзе праз паветраныя пункты пропуску, што стварае для гасцей Рэспублікі Беларусь дадатковыя лагістычныя магчымасці на фоне штучных перашкод і абмежаванняў з боку сумежных заходніх краін.

**Новаўвядзенне аб бязвізавым уездзе праз аўтадарожныя і чыгуначныя пункты пропуску распаўсюджваецца на наступныя краіны:** Аўстрыя, Андора, Бельгія, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна, Ватыкан, Вялікабрытанія, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Ісландыя, Іспанія, Італія, Кіпр, Ліхтэнштэйн, Люксембург, Мальта, Манака, Нідэрланды, Нарвегія, Партугалія, Румынія, Сан-Марына, Паўночная Македонія, Славакія, Славенія, Чэхія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эстонія.

### Меркаванне

# «Нас б'юць — мы лятаем...»

**Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ:**

— Санкцыі, забароны, пазбаўленні... гэтыя экзекуцыі ў дачыненні да Беларусі з боку як Еўрасаюза, так і калектыўнага Захаду можна працягваць. Аднак Беларусь дзейнічае ў першую чаргу ў інтарэсах простых людзей — грамадзян сваёй краіны, а таксама іншых дзяржаў. Бо звычайныя людзі не вінаватыя, што іх кіраўнікі не клапоцяцца пра іх, пра іх дабрабыт, іх родныя і сямейныя сувязі, закрываючы межы, ствараючы калапсы на пагранпераходах. У сваю чаргу, нягледзячы ні на што, Беларусь працягвае паступальную міралюбівую палітыку, адкрываючы грамадзянам новых дзяржаў магчымасць бязвізавага ўезду ў нашу краіну. Нагадаю, што з 2022 года рашэннем менавіта нашага Прэзідэнта бязвізавы ўезд у Беларусь быў дазволены для грамадзян той жа Польшчы, якая літаральна пырскае абурэннем у адрас Беларусі, а таксама Літвы, Латвіі. Учора было прынята рашэнне адкрыць бязвіз яшчэ для 35 краін. Ці не дэманстрацыя гэта абсалютнай адкрытасці, міралюбнасці і добрасуседства? Тая ж Латвія, забараніўшы ўезд транспартным сродкам з беларускімі нумарамі, відавочна была ўпэўнена, што адкажам сіметрычна... Беларусь адказала з дакладнасцю да наадварот... Так што з пятніцы, 19 ліпеня, калі ласка! Толькі прыходзьце са святлом і добрымі намерамі, а ўжо беларусы хлебасольна сустрэнуць.

### Абітурыент-2024

# У рэжыме нон-стоп

**Кампанія па прыёме дакументаў на бюджэт у ВНУ краіны фінішавала 17 ліпеня, а ўжо 20-га свае дзверы для паступаючых расчыняць сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя ўстановы адукацыі. Там прыёмная кампанія працягнецца да 15 жніўня.**

Як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі Беларусі, каледжы ажыццяўляюць прыём дакументаў на два ўзроўні: прафесійна-тэхнічнай адукацыі (ПТА) і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (ССА). На ўзровень ПТА прыёмная кампанія традыцыйна пачалася 15 чэрвеня — ужо амаль месяц вядуць прыём дакументаў 157 устаноў адукацыі.

У міністэрстве таксама нагадалі аб змене тэрміну падачы дакументаў на ўзровень ССА. З улікам карэкціровак на бюджэт дакументы дзевяцікласнікі могуць падаваць з 20 ліпеня да 3 жніўня, адзінаццацікласнікі — з 20 ліпеня да 6 жніўня, «платнікі» — да 13 жніўня. Па інфармацыі адукацыйнага ведамства, у 2024 годзе на ўзровень ССА будуць прыняты 39 тысяч чалавек, больш за 27 тысяч з іх — за кошт сродкаў бюджэту. На ўзровень ПТА — каля 27 тысяч чалавек, і ўсе — за кошт сродкаў бюджэту.

Спецыялісты міністэрства ў чарговы раз праінфармавалі аб тым, што сёлета ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі адкрыліся новыя спецыяльнасці, якія ў асноўным звязаны з вытворчасцю. Напрыклад, у Мінску — гэта такая цікавая сучасная спецыяльнасць, як «Тэхнічная эксплуатацыя мехатронных сістэм электроннай вытворчасці», з'явілася і такая — «Вытворчасць вырабаў мікра- і нанаэлектронікі».

### Глабальны кантэкст

# ВЫКЛЮЧНА БІЗНЕС?



## Чаму нядаўні саміт НАТА эксперты называюць «самітам вайны»

**У перыяд з 9 да 11 ліпеня 2024 г. у Вашынгтоне прайшоў юбілейны саміт НАТА, з рашэннямі якога асобныя аналітыкі звязвалі працэсы забеспячэння еўрапейскай бяспекі. Аднак цуду не адбылося, а выніковыя рашэнні Паўночнаатлантычнага саюза ў чарговы раз прадэманстравалі, што дадзеная арганізацыя — інструмент вайны, прызначаны для захавання сусветнага лідарства Захаду.**

З моманту стварэння НАТА і да сёння ЗША адыгрываюць вядучую ролю ў гэтым саюзе. Адпаведна ключавыя мэты і ўстаноўкі арганізацыі цесна ўвязаны з іх геапалітычнымі памкненнямі і дактрынальнымі палажэннямі. На працягу 75 гадоў Паўночнаатлантычны саюз рэалізоўваў задачу, абазначаную першым Генеральным сакратаром НАТА Гасцінгсам Ісмеем: «Трымаць рускіх звонку, немцаў — унізе, а амерыканцаў — унутры».

І калі ацэньваць дзейнасць НАТА з падобнага пункту гледжання, то існаванне альянсу трэба прызнаць паспяховым. Яму ўдалося развяліць Савецкі Саюз, інтэграваць Германію ў заходнюю сістэму, зрабіўшы яе паслухмянай прыладай прасоўвання ўласных інтарэсаў; захаваць амерыканскае дамінаванне ў Еўропе і поўны кантроль пытанняў забеспячэння бяспекі ў дадзеным рэгіёне. Аднак па сутнасці ўсё гэта не больш, чым «пірава» перамога.

Генерал Дуайт Эйзенхаўэр, першы вярхоўны галоўнакамандуючы сіламі НАТА ў Еўропе, быў цвёрда перакананы, што яго місія заключаецца ў тым, каб зноў паставіць еўрапейцаў «на ваенныя ногі», а не ў тым, каб амерыканскія войскі сталі пастаяннымі целаахоўнікамі Бруселя і Берліна. «Калі праз дзесяць гадоў усе амерыканскія войскі, дыслацыраваныя ў Еўропе ў мэтах нацыянальнай абароны, не будуць вернуты ў Злучаныя Штаты, то ўвесь гэты праект праваліцца», — пісаў Эйзенхаўэр аб НАТА ў 1951 годзе.

Мінула тры чвэрці стагоддзя, а каля 90 тысяч амерыканскіх вайскоўцаў знаходзяцца ў Германіі, Італіі, Вялікабрытаніі і іншых краінах Еўропы. Ніводны еўрапеец за ўвесь гэты перыяд не быў прызначаны на пасаду вярхоўнага галоўнакамандуючага сіламі НАТА ў Еўропе, а згодна са справаздачай Інстытута Катона, доля Злучаных Штатаў у ваенных выдатках альянсу перавышае 61 %.

Рэчаіснасць такая, што пасляваенная «акупацыя» Еўропы працягваецца ў той час, калі глабальных праблем у сферы бяспекі даўно ўжо няма. Міфы аб «усходняй ваеннай пагрозе» і «нападках на дэмакратыю» дазваляюць Вашынгтону апраўдваць любыя ўласныя крокі, у тым ліку тыя, што наносяць шкоду саюзнікам па блоку. Вайна ва Украіне, ініцыіраваная ЗША, наглядна дэманструе: асноўны цяжар ваенных выдаткаў лёг на плечы еўрапейцаў. З 206 млрд долараў ваеннай і неваеннай дапамогі, выдзеленай Украіне краінамі ўсяго свету, толькі 79 млрд паступіла з ЗША. Прычым, большая іх частка не пакінула тэрыторыі Злучаных Штатаў Амерыкі, стаўшы інвестыцыяй у іх уласную эканоміку і ваенную вытворчасць. У сваю чаргу, Кіеву актыўна пастаўляецца зброя, якая закупляецца за кошт выдзеленых крэдытаў. Нічога асабістага, выключна бізнес, дзе Паўночнаатлантычны саюз — філіял амерыканскіх транснацыянальных ваенных карпарацый.

Праз 75 гадоў адсутнасць сур'ёзнага канкурэнта дазволіла ЗША захаваць дамінуючае становішча ў альянсе, а НАТА ператварылася ў інструмент амерыканскага вяршэнства, які паслядоўна пераводзіцца на фінансаванне за кошт Еўрапейскага саюза. Вашынгтон упарта імкнецца да захавання ўласнага дамінавання за кошт кансалідацыі кааліцыйных рэсурсаў НАТА. Невыпадкова 10 ліпеня са старонак газеты The New York Times памочнік прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Джэйк Саліван заклікаў краіны — удзельніцы Паўночнаатлантычнага альянсу садзейнічаць інтэграцыі Украіны ў НАТА і нарошчваць ваенныя выдаткі. Менавіта ў гэтым адна з галоўных мэт юбілейнага збору НАТА. Калі пяць гадоў таму выдзяленне двух працэнтаў ВУП на фінансаванне ваенных расходаў для краін-удзельніц было невыканальнай задачай, то сёння размова ідзе аб абавязковых 2,5 працэнта.

«Нашы саюзнікі павінны трацяць больш. Мы павінны неадкладна працягваць нашу работу па ўмацаванні абароннай прамысловасці, мы павінны працягнуць працаваць над інтэграцыяй Украіны ў еўраатлантычную супольнасць. Мы разлічваем дабіцца значнага прагрэсу па ўсіх гэтых задачах на саміце НАТА на гэтым тыдні», — адзначыў Саліван.

Ключавым вынікам саміту Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавору, які прайшоў 9—11 ліпеня, стала праяўленае нежаданне альянсу рабіць істотныя крокі па членстве Украіны і ўключэнні краіны ва ўласную прастору бяспекі. У той жа час краіны-ўдзельніцы прынялі доўгатэрміновыя абавязацельствы па ваеннай падтрымцы Украіны для змякчэння магчымых наступстваў вяртання на пасаду прэзідэнта ЗША Дональда Трампа ў выніку выбараў у лістападзе.

Ключавым рашэннем саміту НАТА стала абяцанне выдзеліць мінімум 40 мільярдаў еўра Украіне ў якасці ваеннай дапамогі ў 2025 годзе. У выніковую дэкларацыю саміту было ўнесена запэўненне ў доўгатэрміновай падтрымцы Украіны, якія ўключаюць абавязацельствы па выдзяленні ўзбраенняў, а таксама па нясенні расходаў на навучанне ваеннаслужачых Узброеных сіл Украіны.

Акрамя таго, у дакументе з'явіўся пункт аб «незваротным шляху ў альянс» Украіны і падтрымцы краіны ў правядзенні неабходных рэформаў. Аднак падкрэслена, што НАТА «будзе ў стане» запрасіць Украіну, толькі калі ўсе краіны — члены аб'яднання пагодзяцца з гэтым рашэннем.

У рамках саміту прэзідэнт ЗША Джо Байдэн анансаваў перадачу Украіне «дзясяткаў заходніх сістэм СПА» ў якасці ваеннай дапамогі альянсу. Размова ідзе аб пастаўках ракетных комплексаў наземнага базіравання NASAMS, HAWK, IRIS T-SLM, IRIS T-SLS, а таксама зенітных самаходных установак Gepard.

Варта адзначыць, што ваенная дапамога Украіне абмяркоўвалася і ў больш шырокім кантэксце стрымлівання Расіі. У прыватнасці, прэм'ер-міністр Эстоніі Кая Калас анансавала аб'яўленне Расіі доўгатэрміновай пагрозай заходняму свету. У гэтым кантэксце абмяркоўвалася магчымасць вяртання ў вялікую палітыку Трампа. Яго заява аб магчымасці аператыўнага завяршэння ўкраінскай вайны і скарачэнні аб'ёмаў перадачы разведвальнай інфармацыі саюзнікам па блоку выклікала пэўнае замяшанне ў заходніх лідараў.

Чарговы раз закранулі пытанне супрацьдзеяння «экспансіі Кітая». У рабоце саміту НАТА трэці год бяруць удзел лідары Японіі, Рэспублікі Карэя, Новай Зеландыі і Аўстраліі, што дэманструе зацікаўленасць ЗША ў кантролі над Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёнам і пашырэнні сферы інтарэсаў альянсу.

Не забыліся згадаць у выніковай дэкларацыі і Рэспубліку Беларусь. Адзначана, што ў альянсе «выклікае непакой паглыбленне адносін Расіі і Беларусі». Сцвярджаецца, што Беларусь «працягвае садзейнічаць» правядзенню спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне. І гэта на фоне пастаянных мірных ініцыятыў нашай дзяржавы, крокаў па дээскалацыі абстаноўкі, адводу войскаў ад агульнай граніцы і публічных заяў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі: «Мы ніякія не ворагі для ўкраінцаў. Я ўжо шмат разоў казаў. Гэта нашы людзі. Такія ж людзі, як мы, як рускія, расіяне. Нам трэба хутчэй дамаўляцца. Аказваецца, можна дамовіцца. Але галоўнае, трэба размаўляць. Калі няма дыялогу, размовы — гэта будзе эскалацыя, і будуць гінуць людзі».

Увогуле трэба канстатаваць, што трэцяе дзесяцігоддзе XXI стагоддзя ясна дэманструе: сучасны свет становіцца шматпалярным. ЗША страчваюць пераважную індывідуальную ваенную перавагу і спрабуюць яе ўтрымаць за кошт кансалідацыі кааліцыйных рэсурсаў НАТА. Яскравымі таму пацвярджэннямі з'яўляюцца вынікі Вашынгтонскага саміту, адчайныя спробы рэфармавання НАТА і заява прэм'ер-міністра Венгрыі Віктара Орбана, які заклікаў успомніць аб тым, што альянс быў створаны 75 гадоў таму як мірны праект. Цяпер жа нарастаючая ваенізацыя альянсу, які ўсё больш актыўна ўцягваецца ва ўкраінскі канфлікт, пагражае наступствамі, якія немагчыма прадказаць.

Невыпадкова нават у заходніх экспертных палітычных колах з'яўляюцца разумныя ідэі і меркаванні. «Аднапалярны момант канчаткова прайшоў, і мы ўступілі ў новую геапалітычную эпоху — эпоху, якая вызначаецца ў асноўным шматпалярнасцю. Пад'ём Кітая, Расія, якая адраджаецца, больш напорыстая Індыя і пад'ём іншых рэгіянальных дзяржаў стварылі больш складаную, хаатычнае і канкурэнтнае асяроддзе бяспекі. Вось у чым праблема для НАТА і яго прыхільнікаў: адаптаваць альянс да новай шматпалярнай рэчаіснасці, рэканструяваць і перапрафіляваць яго такім чынам, каб ён адпавядаў сваім мэтам у «няўстойлівым шматпалярным свеце», хутчэй за ўсё, немагчыма. І зусім дакладна гэта не будзе каштаваць затрачаных намаганняў, часу і грошай», — адзначаюць спецыялісты.

Сёння мір — галоўны здабытак, а яго захаванне — найважнейшая задача сапраўдных палітыкаў. Час дыктату мінуў, а на змену яму прыходзіць перыяд прагматычнага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Пара б гэта ўсвядоміць і ў НАТА.

**Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.**